(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

ДЗЯРЖАЎНАЯ НАВУКОВАЯ ЎСТАНОВА
«ЦЭНТР ДАСЛЕДАВАННЯЎ БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ, МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ АКАДЭМІІ НАВУК БЕЛАРУСІ»

УДК 398.8 (476)

**ГРЫНЕВІЧ**
**Яніна Ігараўна**

# БЕЛАРУСКІЯ ПАЗААБРАДАВЫЯ ЛІРЫЧНЫЯ ПЕСНІ: ГЕНЕЗІС, СЕМАНТЫКА, ПАЭТЫКА

Аўтарэферат дысертацыі на саісканне вучонай ступені
кандыдата філалагічных навук

па спецыяльнасці 10.01.09 – фалькларыстыка

Навуковы кіраўнік
доктар філалагічных навук
Ліс А.С.

Мінск, 2014

Работа выканана ў аддзеле фалькларыстыкі і культуры славянскіх народаў ДНУ "Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі"

**Навуковы кіраўнік:** **Ліс Арсень Сяргеевіч,** доктар філалагічных навук, вядучы навуковы супрацоўнік аддзела фалькларыстыкі і культуры славянскіх народаў ДНУ "Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі"

**Афіцыйныя апаненты:** **Швед Іна Анатольеўна,** доктар філалагічных навук, прафесар кафедры беларускага літаратуразнаўства УА "Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна"

**Васілевіч Уладзімір Аляксандравіч,** кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры тэорыі і методыкі выкладання мастацтва УА "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка"

**Апаніруючая арганізацыя:** УА "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў"

Абарона адбудзецца 23 кастрычніка 2014 г. у 11.00 гадзін на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 01.42.01 у ДНУ "Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі" па адрасе: 220072, г. Мінск, вул. Сурганава, д. 1, корп. 2, пак. № 302; e-mail: a_hurko@bas-net.by; тэл. вучонага сакратара: 284-29-24.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы ДНУ "Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі" (220072, г. Мінск, вул. Сурганава, д. 1, корп. 2).

Аўтарэферат разасланы "22" верасня 2014 г.

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый,
доктар гістарычных навук, дацэнт — Г.І. Каспяровіч

## КАРОТКІЯ УВОДЗІНЫ

Лірычныя пазаабрадавыя песні – вялікі і істотна важны пласт духоўнай спадчыны беларускага народа. У адрозненне ад абрадавай песнятворчасці, функцыянальна скіраванай на рэгламентацыю жыцця чалавека традыцыйнага грамадства, асвячэнне этапаў яго экзістэнцыі, свят і працоўнай дзейнасці на працягу года, пазаабрадавая лірыка адлюстравала сацыяльны аспект быцця чалавека, па-мастацку глыбока ўвасобіла яго духоўны свет у аспекце ўзаемадачыненняў, пачуццяў і перажыванняў. Яна – важны складнік і рэпрэзентатар менталітэту народа. Творы беларускай пазаабрадавай лірыкі не толькі шырока прадстаўлены ў зборніках фальклору XIX – XXI стст., але і сёння бытуюць у вясковым асяроддзі і з'яўляюцца асновай рэпертуару фальклорных калектываў. Комплекснае даследаванне пазаабрадавых лірычных песень дазволіць раскрыць самабытнасць, унікальнасць і багацце гэтай важнай часткі беларускага фальклору і стане важным этапам у працэсе ўсебаковага вывучэння і сістэматызацыі нематэрыяльнай культурнай спадчыны беларускага народа.

У беларускай фалькларыстыцы ў адрозненне ад рускай (работы Т. Акімавай, Я. Арцёменка, Н. Калпаковай, М. Краўцова, С. Лазуціна, В. Яромінай і інш.) лірычныя пазаабрадавыя песні як асобны, цэласны аб'ект гуманітарнай навукі не даследаваліся. Навукоўцамі разглядаліся асобныя жанравыя разнавіднасці беларускай пазаабрадавай вуснапаэтычнай творчасці (любоўныя, сямейныя-бытавыя, сацыяльна-бытавыя, жартоўныя песні).

На сённяшні дзень у айчыннай фалькларыстыцы няма грунтоўных манаграфічных прац, прысвечаных праблемам генезісу пазаабрадавай лірычнай паэзіі. Нешматлікія даследаванні, у якіх вывучаецца паэтыка беларускіх лірычных песень, вызначаюцца фрагментарнасцю. У іх навукоўцы або аналізуюць паэтыку асобна ўзятых лірычных песень (А. Гурскі), або разглядаюць прынцыпы і прыёмы арганізацыі тэкстаў, кампазіцыйныя формы, тропіку асобных відаў пазаабрадавай песеннай творчасці, напрыклад, казацкіх, салдацкіх, рэкруцкіх (Г. Пятроўская, Л. Луц) і г.д. Недастаткова вывучана і семантыка лірычных пазаабрадавых твораў з пункту гледжання сучасных тэарэтыка-метадалагічных падыходаў, якія дазволілі б вызначыць асноўныя элементы кодаў, што прадстаўлены ў беларускіх вуснапаэтычных творах, выявіць іх семантыку і, адпаведна, дапоўніць карціну фальклорнай сімволікі, рэканструяваць пэўны фрагмент карціны свету беларусаў. Патрабуюць выяўлення таксама асноўныя аспекты функцыянавання канцэпту долі ў беларускіх лірычных пазаабрадавых песнях.

Усё вышэйпералічанае абумоўлівае асаблівую актуальнасць дысертацыйнага даследавання.

Зварот да вывучэння пазаабрадавых лірычных песень выкліканы таксама і культурнымі запатрабаваннямі часу, а менавіта крызісам духоўных каштоўнасцей, які бярэ пачатак з 80-ых гадоў XX стагоддзя і працягваецца цяпер, у першыя дзесяцігоддзі XXI стагоддзя. Ён звязаны з шэрагам палітычных, сацыяльна-эканамічных працэсаў, з наяўнасцю ў беларускім грамадстве шматлікіх, часам узаемавыключальных каштоўнасцей, якія актыўна прапагандуюцца сучаснымі сродкамі масавай інфармацыі. Народныя традыцыі, духоўная спадчына адыгрываюць значную ролю ў абнаўленні нормаў маралі, каштоўнаснай сістэмы грамадства. У сувязі з гэтым узнікае неабходнасць у пераасэнсаванні беларускай культурнай спадчыны (асабліва вуснай народнай творчасці) з мэтай актуалізацыі маральна-этычнага патэнцыялу, увасобленага ў ёй, для таго, каб сфарміраваць нацыяльную сістэму духоўных каштоўнасцей, якія б адпавядалі менталітэту беларусаў і былі заснаваны на спрадвечных уяўленнях народа, яго экзістэнцыі ў прасторы і часе.

Комплекснае вывучэнне беларускіх пазаабрадавых лірычных песень адпавядае прыярытэтнаму напрамку дзяржаўнай палітыкі Рэспублікі Беларусь у галіне культуры – захаванню культурнай спадчыны беларусаў.

- распрацаваць канцэпцыю генезісу беларускіх пазаабрадавых лірычных песень;
- стварыць слоўнік найбольш частотных вобразаў беларускіх пазаабрадавых лірычных песень на аснове тэзауруснага анкетнага апісання слоў, сістэматызаваць матэрыял па кодах, характэрных для беларускіх пазаабрадавых лірычных песень;
- устанавіць семантыку найбольш частотных элементаў кодаў;
- выявіць асноўныя кампазіцыйныя формы, прынцыпы і прыёмы, сродкі мастацкай выразнасці беларускіх пазаабрадавых лірычных песень.

**Аб'ектам** даследавання выступаюць беларускія пазаабрадавыя лірычныя песні. **Прадметам** даследавання з'яўляюцца іх генезіс, семантыка і паэтыка.

Выбар аб'екта і прадмета даследавання абумоўлены тым, што ў айчыннай навуцы адсутнічаюць спецыяльныя навуковыя даследаванні, прысвечаныя праблемам генезісу, семантыкі і паэтыкі беларускіх пазаабрадавых лірычных песень.

**Палажэнні, якія выносяцца на абарону**

1. Адной з крыніц беларускіх пазаабрадавых лірычных песень з'яўляецца абрадавая паэзія, пра што сведчыць наяўнасць агульных матываў, паэтычных прынцыпаў і прыёмаў. Захаванасць рэшткаў міфалагічнай свядомасці ў паэтычнай сістэме пазаабрадавых лірычных песень ускосна ўказвае на ранні перыяд іх фарміравання. Цэнтральным момантам для іх адасаблення ад абраду сталі працэсы дэрытуалізацыі і дэсакралізацыі. Корпус лірычных песень пастаянна папаўняўся песнямі, якія адарваліся ад абраду, фальклярызаванымі творамі літаратурнага паходжання. Істотнымі таксама аказаліся кантактныя ўзаемасувязі і фальклорнае ўзаемаўзбагачэнне.

Дамінуе ў беларускіх пазаабрадавых лірычных песнях канцэпт долі, які ў творах выступае канкрэтным персаніфікаваным, антрапамарфізаваным паняццем. Доля «даецца» пры нараджэнні маці/Богам, суправаджае лірычнага героя на працягу жыцця, але можа быць зменена пры пераходзе да новага этапу жыцця або па ўласнай волі. Доля ў песнях успрымаецца як наканаванне, аднак фаталізм лёсу не абсалютызуецца.

*Упершыню выяўлены генезіс беларускіх пазаабрадавых лірычных песень, устаноўлена спецыфіка функцыянавання іх семантычных дамінантаў.*

2. У беларускіх пазаабрадавых лірычных песнях найбольшую частотнасць і семіятычную нагрузку маюць элементы ландшафтна-тапаграфічнага, расліннага, заанімічнага, гастранамічнага, саматычнага і лічбавага кодаў. Вобразы ў межах кодаў маюць шэраг тыпалагічных рыс і функцый, што забяспечвае іх сістэмнасць і ўстойлівасць. Сінтагматычныя і парадыгматычныя адносіны, у якія ўступае кожны канкрэтны вобраз, вызначаюць яго месца ў міфапаэтычнай карціне свету, суадносіны з іншымі яе

элементамі. Індывідуальныя характарыстыкі вобразаў залежаць ад жанравай разнавіднасці пазаабрадавых лірычных песень.

*Упершыню вызначаны найбольш частотныя коды, прадстаўленыя ў беларускіх пазаабрадавых лірычных песнях, выяўлена семантыка іх асноўных элементаў і іх месца ў міфапаэтычнай карціне свету.*

3. Элементы кожнага з кодаў у беларускіх пазаабрадавых лірычных песнях маюць свае сэнсавыя сферы і выконваюць у тэкстах песень канкрэтныя функцыі. Элементы ландшафтна-тапаграфічнага коду маркіруюць месца дзеяння, суадносяцца з паняццем сваёй/чужой стараны, сімвалізуюць прасторавае памежжа. Раслінныя вобразы абазначаюць полава-ўзроставую прыналежнасць лірычных герояў, выступаюць знакавым месцам падзей, з'яўляюцца медыятарамі паміж светам жывых і памерлых. У раслінных вобразах атрымалі канкрэтнае ўвасабленне ідэалы і маральна-этычныя каштоўнасці традыцыйнага грамадства. Сэнсавая сфера жывёльнага коду – сацыяльная: яго вобразы абазначаюць сацыяльнае становішча лірычных герояў, а таксама іх полава-ўзроставую прыналежнасць. Яны выступаюць пасрэднікамі паміж «сваёй» і «чужой» прасторай, вернымі спадарожнікамі, таварышамі. Парныя заанімічныя вобразы ўвасабляюць ідэал узаемаадносінаў паміж закаханымі. Элементы гастранамічнага коду сімвалізуюць багацце, дабрабыт і маюць медыятыўны характар. Элементы саматычнага коду рэпрэзентуюць чалавека ў цэлым, выяўляюць розум і пачуцці, прыгажосць, а таксама выступаюць паказчыкамі гатоўнасці/негатоўнасці да шлюбу, аб'ектамі фізічнага ўздзеяння.

*Упершыню ўстаноўлены сэнсавыя сферы і функцыянальнасць найбольш частотных кодаў у беларускіх пазаабрадавых лірычных песнях.*

*4.* Асноўныя кампазіцыйныя формы (маналагічная, дыялагічная, апавядальная, двухчастковая, змешаная), прынцыпы і прыёмы (вобразна-псіхалагічны паралелізм, паслядоўнае развіццё падзей, асацыятыўна-ланцуговая сувязь, паступовае звужэнне вобразаў, паўтаральнасць, антытэза, градацыя, траічнасць), тропы (эпітэты, метафары, параўнанні) беларускіх пазаабрадавых лірычных песень знаходзяцца ва ўзаемасувязі, узаемапранікаюць, выконваюць аднолькавыя ідэйна-тэматычныя функцыі. Яны складаюць мастацкую спецыфіку лірычных песень і вылучаюць іх сярод іншых відаў і жанраў фальклору.

*Упершыню вызначаны асноўныя кампазіцыйныя формы, прынцыпы і прыёмы беларускіх пазаабрадавых лірычных песень.*

**Асабісты ўклад саіскальніка**

Дысертацыйная работа з'яўляецца комплексным навуковым даследаваннем, усе палажэнні якога распрацаваны аўтарам самастойна на аснове аналізу шырокай базы крыніц і навуковай літаратуры. У ёй упершыню ў

беларускай фалькларыстычнай навуцы пазаабрадавыя лірычныя песні разгледжаны як цэласны аб'ект, устаноўлены шляхі іх генезісу, выяўлены і ахарактарызаваны асноўныя семантычныя дамінанты, вызначаны найбольш частотныя коды і семантыка, заканамернасці функцыянавання іх элементаў, вылучаны асноўныя кампазіцыйныя формы, прынцыпы і прыёмы названых песенных твораў.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі**

Вынікі дысертацыйнага даследавання былі прадстаўлены і абмеркаваны на Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Европа 2010: глобальное и локальное» (г. Вільнюс, 15–16 мая 2010), Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі «Роля традыцый народнай культуры ў адраджэнні беларускага сяла» (г. Іванава, 24 верасня 2010), Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Нацыянальная культура і мастацтва Беларусі ў еўрапейскім кантэксце» (г. Мінск, 18–19 лістапада 2010), Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Аўтэнтычны фальклор: праблемы вывучэння, захавання, пераймання» (г. Мінск, 29–30 красавіка 2011), XXI Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Гісторыя рэлігій на Украіне» (г. Львоў, 23–26 мая 2011), Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Традыцыі і сучасны стан культуры і мастацтваў» (г. Мінск, 10–11 лістапада 2011), IX Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Этносоциальные и конфессиональные процессы в современном обществе» (г. Гродна, *2–3 снежня 2011), Міжнароднай навуковай* канферэнцыі «Інстытут беларускай культуры і станаўленне навукі ў Беларусі (да 90-годдзя стварэння Інстытута беларускай культуры)» (г. Мінск, 8–9 снежня 2011), XXII Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Гісторыя рэлігій на Украіне» (г. Львоў, 9–13 траўня 2012), круглым стале «Традыцыйнае мастацтва (абрадавы фальклор) на сучаснай сцэне» (г. Мінск, *10 снежня 2012), III* Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Традыцыі і сучасны стан культуры і мастацтваў» (г. Мінск, 25–26 красавіка 2013), VII Навукова-практычнай канферэнцыі «Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання» (г. Мінск, 26–28 красавіка 2013).

*Асноўныя палажэнні дысертацыйнага даследавання былі абмеркаваны на* пасяджэнні аддзела фалькларыстыкі і культуры славянскіх народаў ДНУ «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі» (пратакол №7 ад 18.07.2013), а таксама на Вучоным савеце ДНУ «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі» (пратакол №9 ад 8.11.2013).

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі**

Матэрыялы і вынікі даследавання адлюстраваны ў 16 публікацыях аўтара агульным аб'ёмам 5,9 аўт. арк. У навуковых выданнях, рэкамендаваных ВАК,

надрукаваны 4 артыкулы аб'ёмам 1,9 аўт. арк. Апублікавана 12 матэрыялаў міжнародных і рэспубліканскіх навуковых канферэнцый аб'ёмам 4 аўт. арк.

**Структура і аб'ём дысертацыі**

Дысертацыя складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі работы, чатырох глаў, заключэння, бібліяграфічнага спісу, двух дадаткаў. Агульны аб'ём работы складае 178 старонак, з іх 105 старонак займае асноўны тэкст. Спіс крыніц, выкарыстаных пры напісанні работы, складае 19 старонак і змяшчае 220 адзінак, у тым ліку 16 уласных публікацый саіскальніка. Дадатак А займае 19 старонак і змяшчае запісы пазаабрадавых лірычных песень, зробленыя аўтарам. Дадатак Б займае 35 старонак, у ім змешчаны слоўнік мовы беларускіх пазаабрадавых лірычных песень, складзены на аснове тэзаўруснага анкетнага апісання.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ ДЫСЕРТАЦЫІ

Ва **Уводзінах** абгрунтоўваецца актуальнасць, выбар тэмы дысертацыйнага даследавання, акрэсліваецца кола асноўных праблем.

У першай главе **«Аналітычны агляд літаратуры, крыніцы, метады даследавання»** разгледжаны крыніцы і навуковая літаратура, ахарактарызавана тэарэтыка-метадалагічная база работы.

У раздзеле 1.1 **«Аналітычны агляд літаратуры, метады»** вызначаецца, што беларускія пазаабрадавыя лірычныя песні – гэта сукупнасць непрымеркаваных народнапесенных твораў, якія належаць да лірычнага роду (да іх адносяцца наступныя жанравыя разнавіднасці песень: любоўныя, сямейна-бытавыя, сацыяльна-бытавыя, жартоўныя). Паказана, што вылучэнне іх у якасці самастойнага аб'екта даследавання абумоўлена шэрагам агульных рыс як на ўзроўні бытавання, так і на вербальным узроўні: непрымеркаванасцю да пэўных этапаў абраду, дзеяння, руху; варыятыўнасцю пазаабрадавых лірычных песень у адрозненне ад абрадавай паэзіі, тэксты якой найменш паддаюцца зменам; адметным музычным характарам у параўнанні з абрадавай лірыкай, а таксама з іншымі лірычнымі жанрамі; перавагай ідэйна-эмацыянальнага пачатку над апавядальным; агульнасцю паэтычных сродкаў, прынцыпаў і прыёмаў. Устаноўлена, што комплексна беларускія пазаабрадавыя лірычныя песні не вывучаліся (даследаваліся, як правіла, жанравыя разнавіднасці лірычных песень), аднак асобныя аспекты іх праблематыкі знайшлі адлюстраванне ў работах беларускіх, украінскіх і рускіх даследчыкаў.

Вызначаны асноўныя напрамкі вывучэння беларускіх пазаабрадавых лірычных песень: даследаванне праблем класіфікацыі (Н. Гілевіч, А. Фядосік і інш.), ідэйна-тэматычнага зместу (М. Гваздзёў, А. Гурскі, З. Мажэйка,

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

## Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі

1. Беларускія пазаабрадавыя лірычныя песні ўзніклі на аснове архаічнай абрадавай паэзіі, што пацвярджаецца наяўнасцю агульных матываў, паэтычных прынцыпаў і прыёмаў у абрадавай і пазаабрадавай паэзіі, а таксама магічных элементаў у апошняй. Захаванасць рэшткаў міфалагічнай свядомасці ў паэтычнай сістэме пазаабрадавых лірычных песень ускосна ўказвае на ранні перыяд іх фарміравання. Цэнтральным момантам для іх адасаблення ад абраду сталі працэсы дэрытуалізацыі і дэсакралізацыі. Важным з'яўляецца папаўненне традыцыйнага рэпертуару фальклярызаванымі творамі літаратурнага паходжання, а таксама песнямі, якія страцілі сувязь з абрадам. Кантактныя ўзаемасувязі і фальклорнае ўзаемаўзбагачэнне таксама аказалі істотны ўплыў на фарміранне рэпертуару пазаабрадавых лірычных песень.

Усе калізіі і вобразы ў беларускіх пазаабрадавых лірычных песнях звязаны з дамінантным канцэптам долі. Доля-нядоля ў песенных творах выступае канкрэтным персаніфікаваным паняццем: выяўляецца ў выглядзе жывой істоты, расліны, матэрыяльнага прадмета. Яна даецца чалавеку пры нараджэнні маці/Богам і суправаджае яго на працягу жыцця, але можа быць зменена пры пераходзе да новага этапу жыцця (пры ўступленні ў шлюб), а таксама па ўласнай волі. Доля ў песнях успрымаецца як наканаванне, аднак фаталізм лёсу не абсалютызуецца. Канцэпт долі напрамую суаносіцца з матывамі рэкруцкага набору, службы ў войску, ужывання п'яных напояў, стратай вянка, непасільнай працай і інш. [1; 3; 7; 10].

2. У беларускіх пазаабрадавых лірычных песнях найбольш частотнымі з'яўляюцца ландшафтна-тапаграфічны, раслінны, заанімічны, гастранамічны, саматычны, лічбавы коды. Вобразы ў межах названых ко́даў выяўляюць шэраг тыпалагічных рыс і функцый, што забяспечвае іх сістэмнасць і ўстойлівасць. Іх семантыка залежыць ад рэальных уласцівасцей, ад суаднесенасці з дыхатаміямі свой/чужы, культурны/прыродны, верхні/ніжні, пярэдні/задні, блізкі/далёкі, правы/левы, салодкі/горкі, наяўнасць смаку/адсутнасць смаку, белы/румяны, цотны/няцотны і інш., якія праецыруюцца на аксіялагічную вось (дабро/зло). Сінтагматычныя і парадыгматычныя адносіны, у якія ўступае кожны канкрэтны вобраз, вызначаюць яго месца ў міфапаэтычнай карціне свету, суадносіны з іншымі яе элементамі.

Для беларускіх пазаабрадавых лірычных песень актуальны вертыкальная (верх-ніз) і гарызантальная (усход-захад) восі светабудовы, якія лёгка пераходзяць адна ў адну. Даліна, магіла, трава адпавядаюць ніжняму ярусу светабудовы, гара, сонца, месяц, зоркі – верхняму. Птушкі, конь з'яўляюцца

пасрэднікамі, медыятарамі паміж «сваёй» і «чужой» прасторай, светам жывых і памерлых. Акультуранай, «сваёй» тэрыторыяй з'яўляецца сад, а «чужой» – Украіна, Крым. Гай, дарога, дрэва, лес, мора, мост, поле, рака, Дунай выступаюць у песенных творах памежнымі локусамі. На «чужой» тэрыторыі лакалізуюцца трава, каліна, казак (памерлы), два малойцы маладзенькі (параненыя), чумак, жаўнер, конь, магіла, смерць, туман, студня, яма і інш.; на «сваёй» – птушкі, зязюля, салавей, два салавейкі, пава, дзяўчына, казак, татачка, матуля, мілы, сястра з братам, цвяточкі, ягадкі, яблык, грушы, вішня, чарэшанька, вінаградачак, цукровенькі гарох, цукровенькі аграст, кветкі, лілея, сінь цвяточак, кветачка-аднaлетачка, ружы кветка, трава, рута-мята, хмель, крыніца, ложа, хатка і інш. Пры гэтым межы паміж імі з'яўляюцца рухомымі і залежаць ад дзеяння канкрэтных апазіцый [11; 13].

3. Элементы кожнага з кодаў у беларускіх пазаабрадавых лірычных песнях маюць свае сэнсавыя сферы і выконваюць у тэкстах песень канкрэтныя функцыі. Элементы ландшафтна-тапаграфічнага кода маркіруюць «сваю» тэрыторыю, знакавае месца, цэнтр, дзе адбываюцца істотныя для песні падзеі, выступаюць у якасці памежнага локуса, іншасвету, «чужой» стараны. Раслінныя вобразы выкарыстоўваюцца для абазначэння полава-ўзроставай прыналежнасці лірычных герояў; абазначаюць месца, дзе адбываюцца знакавыя для песні падзеі. У заанімічных вобразах рэпрэзентуюцца полава-ўзроставая прыналежнасць, сацыяльнае становішча лірычных герояў, уяўленні пра ідэал узаемаадносін паміж закаханымі. Вобразы жывёл маюць медыятыўны характар. Элементы гастранамічнага кода ў беларускіх пазаабрадавых лірычных песнях выступаюць паказчыкамі заможнасці, дастатку, выкарыстоўваюцца для абазначэння інтымных стасункаў, маюць семантыку страты дзявоцтва, ліхой і горкай долі, ужываюцца ў значэнні праверкі маральна-этычных якасцей дзяўчыны, а таксама абазначаюць пераход з чужога свету ў свой ці наадварот. Элементы саматычнага кода ў песенных творах з'яўляюцца аб'ектамі фізічнага ўздзеяння, а таксама выступаюць сімваламі пэўных абстрактных паняццяў: галава – розуму, сэрца – пачуццяў, лічанька, вочы і бровы – прыгажосці, маладосці, з'яўляюцца аб'ектамі фізічнага ўздзеяння. Элементы лічбавага кода ў беларускіх пазаабрадавых лірычных песнях дапаўняюць семантыку канкрэтных вобразаў, указваюць на іх важныя характарыстыкі. Лічбы выкарыстоўваюцца для абазначэння колькасці персанажаў; для вылучэння канкрэтнага персанажа/аб'екта; для абазначэння часу, месца дзеяння, колькасці прадметаў, з'яў і г.д., якія маюць цэнтральнае значэнне для развіцця сюжэту твора. У некаторых кантэкстах лічбы выступаюць узаемазамяняльнымі [2; 7; 8; 15; 16].

4. Асноўныя прынцыпы і прыёмы арганізацыі тэкстаў, формы кампазіцыйнай будовы беларускіх пазаабрадавых лірычных песень маюць

глыбокія генетычныя сувязі з міфалагічным тыпам мыслення. Кампазіцыйнымі формамі вуснанародных твораў з'яўляюцца маналагічная, дыялагічная, апавядальная, двухчастковая, змешаная. Выяўлены іх найбольш частотныя кампазіцыйныя прынцыпы і прыёмы – паслядоўнае развіццё падзей, асацыятыўная ланцужковая сувязь, паступовае звужэнне вобразаў, псіхалагічны паралелізм, паўтор, градацыя, траічнасць. Кампазіцыйныя кампаненты, сродкі мастацкай выразнасці існуюць ва ўзаемасувязі, узаемапранікаюць, складаюць цэласную мастацкую сістэму і выконваюць аднолькавыя ідэйна-тэматычныя функцыі. Драматызм, экспрэсіўнасць, дынамізм пазаабрадавых лірычных песень, створаныя з дапамогай узаемадзеяння шырокага спектра паэтычных прыёмаў, складаюць іх мастацкую спецыфіку і вылучаюць сярод іншых відаў і жанраў фальклору [4].

## Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў дысертацыі

Матэрыялы даследавання паспяхова выкарыстоўваюцца пры выкладанні курса «Беларуская мова» ў ДНУ «Інстытут падрыхтоўкі навуковых кадраў НАН Беларусі». Таксама вынікі даследавання знайшлі шырокае прымяненне пры фарміраванні рэпертуару фальклорнага калектыву «Малёўскі фальклорны гурт», які дзейнічае пры Карцэвіцкім сельскім Доме культуры.

Матэрыялы даследавання могуць знайсці практычнае прымяненне ў сістэме адукацыі: пры выкладанні курсаў фалькларыстыкі, беларускай міфалогіі, гісторыі культуры Беларусі, гісторыі беларускай літаратуры, беларускай мовы; пры напісанні падручнікаў і метадычных дапаможнікаў, навукова-даследчых работ па духоўнай культуры беларусаў; пры падрыхтоўцы курсавых, дыпломных і магістарскіх работ. Таксама навуковыя вынікі дысертацыйнага даследавання могуць быць выкарыстаны ў дзейнасці ўстаноў культуры (пры правядзенні культурна-асветніцкіх мерапрыемстваў, фарміраванні рэпертуару фальклорных калектываў і інш.). Матэрыялы дысертацыі маюць значны патэнцыял для патрыятычнага і маральнага-этычнага выхавання дзяцей і моладзі.

Практычная значнасць даследавання таксама заключаецца ў тым, што атрыманыя новыя звесткі могуць быць выкарыстаны ў якасці слоўніка мовы беларускіх пазаабрадавых лірычных песень.

## СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ САІСКАЛЬНІКА ПА ТЭМЕ ДЫСЕРТАЦЫІ

**Артыкулы ў перыядычных навуковых выданнях, уключаных у Пералік ВАК Рэспублікі Беларусь**

1. Грыневіч, Я.І. Генезіс народнай лірыкі / Я.І. Грыневіч // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі : Вып. 11 / Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фалькларыстыкі імя К. Крапівы НАН Беларусі ; навук. рэд. А.І. Лакотка. – Мінск : Права і эканоміка, 2011. – С. 345–352.
2. Грыневіч, Я.І. Аб'екты прыроды ў ландшафтна-тапаграфічным кодзе беларускай пазаабрадавай лірыкі / Я.І. Грыневіч // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі : Вып. 12 / Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фалькларыстыкі імя К. Крапівы НАН Беларусі ; навук. рэд. А.І. Лакотка. – Мінск : Права і эканоміка, 2012. – С. 362–367.
3. Грыневіч, Я.І. Канцэпт долі ў беларускай народнай лірыцы / Я.І. Грыневіч // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі : Вып. 14 / Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фалькларыстыкі імя К. Крапівы НАН Беларусі ; навук. рэд. А.І. Лакотка. – Мінск : Права і эканоміка, 2013. – С. 238–246.
4. Грыневіч, Я.І. Кампазіцыя беларускай народнай лірыкі / Я.І. Грыневіч // Весці Нац. акад. навук Беларусі. Сер. гум. навук. – 2013. – №3. – С. 77–81.

**Артыкулы ў замежных навуковых выданнях**

5. Грыневіч, Я.І. Беларуска-ўкраінскія фальклорныя сувязі: вобраз казака ў беларускай народнай любоўнай песні / Я.І. Грыневіч // Історія релігій в Україні : науковий щорічник / упоряд. О. Киричук, М. Омельчук, І. Орлевич. – Львів : Львівський музей історіі релігіі, вид-во «Логос», 2010. – Книга 1. – С. 67–74.
6. Грыневіч, Я.І. Беларуска-ўкраінскія фальклорныя сувязі: матыў долі-нядолі ў пазаабрадавым песенным фальклоры / Я.І. Грыневіч // Історія релігій в Україні : науковий щорічник / упоряд. О. Киричук, М. Омельчук, І. Орлевич. – Львів : Львівський музей історіі релігіі, вид-во «Логос», 2011. – Книга 2. – С. 316–324.
7. Грыневіч, Я. Тапонімы Украіны ў беларускай пазаабрадавай народнай лірыцы / Я. Грыневіч // Історія релігій в Україні : науковий щорічник / упоряд. О. Киричук, М. Омельчук, І. Орлевич. – Львів : Інститут

релігіезнавства – філія Львівського музею історіі релігіі; вид-во «Логос», 2012. – Книга 1. Частина 1 : Історія. – С. 68–74.

## Матэрыялы навуковых канферэнцый

8. Грыневіч, Я.І. Матыў чараўніцтва ў любоўнай лірычнай песні / Я.І. Грыневіч // Европа 2010: глобальное и локальное : материалы международной конференции студентов ; 15–16 мая 2010., г. Вильнюс. – Вильнюс : ЕГУ, 2011. – С. 93–100.
9. Грыневіч, Я.І. Да пытання аб класіфікацыі беларускай народнай любоўнай песні / Я.І. Грыневіч // Роля традыцый народнай культуры ў адраджэнні беларускага сяла : матэрыялы Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі (24 верасня 2010 года, г. Іванава) / [укладальнікі: А.Г. Алфёрава, Н.С. Бункевіч ; рэдкалегія: А.І. Лакотка (галоўны рэдактар) і інш.]. – Мінск : Права і эканоміка, 2010. – С. 137–141.
10. Грыневіч, Я.І. Матыў долі-нядолі ў беларускай народнай любоўнай песні / Я.І. Грыневіч // Беларуская пісьмовая спадчына ў кантэксце еўрапейскага культурна-гістарычнага працэсу XI – XIX стагоддзяў: вытокі, традыцыі, уплывы. Матэрыялы Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі (Мінск, 24 мая 2010 г.) / Інстытут мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі. – Мінск, 2010. – С. 345–348.
11. Грыневіч, Я.І. Дыхатамія «свой-чужы» ў сямейна-бытавой лірыцы / Я.І. Грыневіч // Аўтэнтычны фальклор: праблемы вывучэння, захавання, пераймання. – Мінск, 2011.
12. Грыневіч, Я.І. Традыцыйныя ўяўленні пра шлюбнага партнёра і іх адлюстраванне ў народнай любоўнай лірыцы / Я.І. Грыневіч // Этнокультурное развитие Беларуси в XIX – начале XXI в. : материалы международной научно-практической конференции; 19–20 мая 2010., г. Минск. – Минск : Издательский центр БГУ, 2011. – С. 88–93.
13. Грыневіч, Я.І. Дыхатамія «свой-чужы» ў беларускай пазаабрадавай лірыцы / Я.І. Грыневіч // Этносоциальные и конфессиональные процессы в современном обществе : сб. науч. ст. / ГрГУ им. Я. Купалы ; редкол.: М.А. Можейко (гл. ред.) [и др.]. – Гродно : ГрГУ, 2012. – С. 285–288.
14. Грыневіч, Я.І. Інстытут Беларускай Культуры і развіццё фалькларыстыкі / Я.І. Грыневіч // Институт белорусской культуры и становление науки в Беларуси: материалы Международной научной конференции Минск 7–9 декабря 2011 г. – Минск : Бел. Навука, 2012. – С. 108–113.
15. Грыневіч, Я.І. Кулінарны код у беларускай любоўнай лірыцы / Я.І. Грыневіч // Традыцыі і сучасны стан культуры і мастацтваў : матэрыялы Міжнар.

навук.-практ. канф., Мінск, 10–11 ліст. 2011 г. / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ім. К. Крапівы ; [уклад.: Н.С. Бункевіч і інш. ; рэдкал.: А.І. Лакотка (гал. рэд.) і інш.]. – Мінск, 2011. – С. 237–240.

16. Грыневіч, Я.І. Семантыка вобразаў культурных аб'ектаў у беларускай народнай лірыцы / Я.І. Грыневіч // Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання. – Мінск : БДУКМ, 2013. – С. 107–109.

# РЭЗЮМЭ

**Грыневіч Яніна Ігараўна**

**Беларускія пазаабрадавыя лірычныя песні: генезіс, семантыка, паэтыка**

**Ключавыя словы:** пазаабрадавыя лірычныя песні, генезіс, вобраз, семантыка, код, функцыянальнасць, кампазіцыйныя формы, прынцыпы і прыёмы.

**Мэта даследавання:** комплексны аналіз беларускіх пазаабрадавых лірычных песень, вызначэнне іх генезісу, семантыкі і функцыянальнасці асноўных песенных вобразаў, а таксама асаблівасцей паэтыкі.

**Метады даследавання:** комплексны і сістэмны падыходы, апісальны, супастаўляльны, гісторыка-тыпалагічны, структурна-тыпалагічны, структурна-семіятычны метады, методыка тэзаўруснага анкетнага апісання слоў. Для выяўлення частотнасці ўжывання ключавых слоў быў выкарыстаны колькасны метад.

**Атрыманыя вынікі і іх навуковая навізна:** упершыню ў беларускай фалькларыстыцы комплексна і паглыблена вывучаюцца пазаабрадавыя лірычныя песні, сістэматызуюцца навуковая літаратура і крыніцы даследавання, вызначаецца генезіс пазаабрадавых лірычных песень, спецыфіка функцыянавання іх семантычных дамінантаў, найбольш частотныя коды, семантыка іх асноўных элементаў і месца ў міфапаэтычнай карціне свету. Таксама ўпершыню ўстаноўлены сэнсавыя сферы і функцыянальнасць найбольш частотных кодаў, вызначаны і прааналізаваны кампазіцыйныя формы, прынцыпы і прыёмы беларускіх пазаабрадавых лірычных песень.

**Рэкамендацыі па выкарыстанні:** Матэрыялы даследавання паспяхова выкарыстоўваюцца пры выкладанні курса «Беларуская мова» ў ДНУ «Інстытут падрыхтоўкі навуковых кадраў НАН Беларусі». Таксама вынікі даследавання знайшлі шырокае прымяненне пры фарміраванні рэпертуару фальклорнага калектыву «Малёўскі фальклорны гурт», які дзейнічае пры Карцэвіцкім сельскім Доме культуры.

Практычная значнасць даследавання заключаецца таксама ў тым, што атрыманыя новыя звесткі могуць быць выкарыстаны ў якасці даведніка па семантыцы і функцыянальным прызначэнні асноўных вобразаў беларускіх пазаабрадавых лірычных песень.

**Галіна выкарыстання:** фалькларыстыка, культуралогія

РЕЗЮМЕ

**Гриневич Янина Игоревна**

**Белорусские необрядовые лирические песни: генезис, семантика, поэтика**

**Ключевые слова:** необрядовые лирические песни, генезис, образ, семантика, код, функциональность, композиционные формы, принципы и приёмы.

**Цель исследования:** комплексный анализ белорусских необрядовых лирических песен, определение их генезиса, семантики и функциональности основных песенных образов, а также особенностей поэтики.

**Методы исследования:** теоретической и методологической основой стали комплексный и системный подходы, описательный, сопоставительный, историко-типологический, структурно-типологический и структурно-семиотический методы, методика тезаурусного анкетного описания слов. Для определения частотности употребления ключевых слов использовался метод количественного анализа.

**Полученные результаты и их новизна:** впервые в белорусской фольклористике комплексно и углублено изучаются необрядовые лирические песни, систематизируются научная литература и источники, определяется генезис необрядовых лирических песен, специфика функционирования их семантических доминант, наиболее частотные коды, семантика их основных элементов и место в картине мира. Также впервые установлены смысловые сферы и функциональность наиболее частотных кодов, определены и проанализированы композиционные формы, принципы и приёмы белорусских необрядовых лирических песен.

**Рекомендации по использованию:** материалы исследования успешно используются при преподавании курса «Белорусский язык» в ГНУ «Институт подготовки научных кадров НАН Беларуси». Также результаты исследования нашли широкое применение при формирования репертуара фольклорного коллектива «Малевская фольклорная группа», которая действует при Карцевичском сельском Доме культуры.

Практическая значимость исследования также заключается в том, что полученные новые сведения могут быть использованы в качестве справочника по семантике и функциональному назначению основных образов белорусских необрядовых лирических песен.

**Область использования:** фольклористика, культурология

SUMMARY

**Hrynevich Yanina Iharauna**

**Belarusian traditional lyric songs: genesis, poetics**

**Key words:** traditional lyric songs, genesis, image, semantics, code, functionality, forms, principles and methods of composition.

**Research objectives:** to conduct comprehensive study of Belarusian traditional lyric songs, to define their genesis, semantics and functionality of its main images, as well as their poetics features.

**Research methods**: the research is based on complex and system approaches, descriptive, comparative, historical-typological, structural-typological and structural-semiotics methods, and the technique of thesaurus biographical description of words. Quantitative analysis method was used for keywords frequency count.

**Findings and their novelty:** the given thesis is one of the first comprehensive and thorough researches of traditional lyric songs. It systematized scientific literature and sources, defined traditional lyric songs genesis, specifics of functioning of the songs' semantic dominants, the most frequent codes, semantics of their basic elements and their place in the picture of the world. The work for the first time establishes semantic spheres and functionality of the most frequent codes, defines and analyses composite forms, principles and methods of Belarusian traditional lyric songs.

**Recommendations for use:** The results of the research are successfully used while preparing and teaching the course «Belarusian language» in the «Research Training Institute of the National Academy of Science of Belarus». The research finding also broad application in forming repertoire of «Maliouskaya Folklore Group» acting at Kartsevichsky village Recreation center.

The special practical importance of the research is that the received new data can be used as a dictionary on semantics and a functional purpose of the main images of the Belarusian traditional lyric songs.

**Field of use:** folkloristic, cultural studies

Подписано в печать 19.09.2014 Формат 60x84 1/16 Бумага офсетная
Гарнитура Roman Печать цифровая Усл.печ.л. 1,3 Уч.изд.л. 1,4 Тираж 60 экз. Заказ № 1851
ИООО «Право и экономика» 220072 Минск Сурганова 1, корп. 2 Тел. 284 18 66, 8 029 684 18 66
E-mail: pravo-v@tut.by Отпечатано на издательской системе KONICA MINOLTA в ИООО «Право и экономика» Свидетельство о государственной регистрации издателя, изготовителя, распространителя печатных изданий, выданное
Министерством информации Республики Беларусь 17 февраля 2014 г.
в качестве издателя печатных изданий за № 1/185